## СВЯТЛАНА ГУТКОЎСКАЯ



Харэаграфічнае мастацтва ў Беларусі ў апошні час характарызуецца шматвектарнасцю развіцця. Творы ўзнікаюць у шырокай жанравай амплітудзе — ад спектакляў, вырашаных сродкамі класічнага танца, да балетаў на матэрыяле contemporary dance; ад нумароў у традыцыях народна-сцэнічнай харэаграфіі да кампазіцый сінтэтычнага характару. Апошнія ўключаюць, акрамя танцавальных, элементы цыркавога мастацтва, гімнастыкі, акрабатыкі ў злучэнні з аўдыё- і візуальнымі эфектамі.

У сферы сучаснай харэаграфіі адбываецца перыяд назапашвання, відавочная тэндэнцыя да новых адкрыццяў. Невыпадкова ў фінал XXVII Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску выйшлі сем твораў беларускіх балетмайстраў (два апынуліся сярод пераможцаў). Такога яшчэ не было, і гэта надзвычайны вынік. Спецыяльнай прэміяй экспертнай рады «За ўнёсак у развіццё беларускага contemporary dance» была адзначана Вольга Скварцова — мастацкі кіраўнік мінскай «SKVO'S Dance Company», спецыяльную прэмію журы «За таленавіты дэбют» атрымаў малады харэограф Валянцін Ісакаў з Гомеля. Не абыходзіць галіну сучаснага танца і Вялікі тэатр. Улетку прайшоў балетны фестываль, у межах якога беларуская публіка працягнула знаёмства з шэдэўрамі Джорджа Баланчына і іншых сусветна вядомых балетмайстраў. Восенню адбыўся вечар сучаснай харэаграфіі з пастаноўкамі знакамітага Раду Паклітару, якога Беларусь дагэтуль па праве лічыць сваім.

Адной з прыкмет мінулага года сталі юбілейныя канцэрты вядучых калектываў, якія прадстаўляюць жанр народна-сцэнічнай харэаграфіі. Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі — ста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэйшы прафесійны калектыў — адзначыў 55-годдзе. Беларускі харэаграфічны ансамбль «Харошкі» адсвяткаваў 40 гадоў з часу стварэння, з нагоды чаго паказаў серыю канцэртаў.

Але ёсць і нагода для неспакою. Нельга не адзначыць, што нашы маладыя балетмайстры ўсё радзей звяртаюцца непасрэдна да мовы беларускага танца. Мовы, сфармаванай ва ўлонні народнай творчасці, якая развівалася вякамі і здабыла ў XX стагоддзі яркія сцэнічныя формы і разнастайнасць жанраў. У лепшым выпадку нам дэманструюць яе стылізацыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ